Источник: “Звязда” – 2016-10-20

# Грычына

«Дапамажыце разабрацца, адкуль паходзіць назва вёскі Грычына, што ў Дзяржынскім раёне».

Віталь Кухаронак, Фаніпаль



На вашы пытанні адказвае старшыня Рэспубліканскай тапанімічнай камісіі пры НАН Беларусі Ігар Капылоў.

Вёска Грычына Дзяржынскага раёна мае не толькі адметную назву, але і багатую гісторыю.

Упершыню паселішча згадваецца ў 1547 годзе. Але людзі на гэтым месцы пасяліліся намнога раней, пра што сведчаць выяўленыя вучонымі ў наваколлі Грычына курганныя могільнікі X — XI стагоддзяў. У розныя гістарычныя перыяды мянялася адміністрацыйна-тэрытарыяльная прыналежнасць населенага пункта. У сярэдзіне XVI стагоддзя паселішча размяшчалася на землях Менскага павета ВКЛ. На той час назва мела форму Грычын, якую і трэба лічыць самай старажытнай. У першай палове XVII стагоддзя вёска адносілася да маёнтка Койданава Мінскага павета Мінскага ваяводства. У 1793 годзе, пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай, адышла да Расійскай імперыі. У гэты час суіснавалі два варыянты назвы — Грычын і Грычына. У сярэдзіне XIX стагоддзя значылася ў складзе маёнтка Віцкаўшчына. У канцы XIX стагоддзя належала да Самахвалавіцкай воласці Мінскага павета Мінскай губерні. Мяняліся і гаспадары паселішча. Напачатку вёска была ўласнасцю князёў Радзівілаў, затым, у сярэдзіне XIX стагоддзя, ёй валодаў князь П. Вітгенштэйн. Гістарычныя энцыклапедычныя даведнікі змяшчаюць звесткі пра Грычына як месца сялянскіх антыфеадальных выступленняў 1656 года. Жыхары вёскі моцна пацярпелі і падчас вайны Расійскай імперыі з Францыяй. Па сведчанні гісторыкаў, у лістападзе 1812 года напалеонаўскія войскі, разгромленыя рускай арміяй у Койданаўскай бітве, адступалі праз Грычына, і вёска была спалена.

Пошукі паходжання назвы вёскі трэба пачынаць з яе структуры: фінальная частка -ына падказвае, што найменне мела прыналежны характар. Бясспрэчна, што вёска сваю назву атрымала ад імя землеўласніка або першазаснавальніка паселішча. Аднак разыходзяцца думкі вучоных адносна паходжання назвы гэтага паселішча. Так, прафесар В.А. Жучкевіч паходжанне назвы Грычыназвязвае са старажытным словам грыч, якое ў старажытнарускіх (агульнаўсходнеславянскіх) пісьмовых помніках ужывалася ў значэнні «сабака». І ў якасці прыкладу прыводзіць тэкст са «Слоўніка старажытнарускай мовы» І.І. Сразнеўскага: «Человек нежы убіен бысть разбойникомъ: гричь же храняше тело господина своего; некий же человекъ гряды мимо погребе его; гричь же, видев яко добре дело сотвори, последова ему и служаше ему добре». У такім жа значэнні слова грич ужывалася і ў старабеларускай мове. У помніку пачатку XVII стагоддзя «Хронiцы М. Бельскага» нават удакладняецца значэнне гэтага слова: «взявши з собою грича або пса и шол с ним в дорогу». Аднак версія В.А. Жучкевіча выклікае вялікія сумненні. Больш праўдападобнай з'яўляецца версія прафесара В.П. Лемцюговай, якая лічыць, што ў аснове назвы Грычына ляжыць уласнае імя Грыч — варыянт царкоўнага праваслаўнага імя Григорий. У старабеларускіх пісьмовых крыніцах XVI стагоддзя гэта імя адзначаецца ў вытворнай форме:«Гричинович Гаврило, Гричинович Иван, Гричинович Пётр».

На тэрыторыі Беларусі сустракаюцца яшчэ тры аднакаранёвыя назвы: Грычна, назва балотных масіваў у Лунінецкім і Салігорскім раёнах і вёска Грычынавічы ў Жыткавіцкім раёне Гомельскай вобласці.

P.S. Шаноўныя чытачы!

Вас цікавіць, што азначае назва горада, вёскі ці мястэчка, у якіх вы жывяце? А можа, той мясцовасці, адкуль вы родам? Вам хочацца ведаць, адкуль пайшлі найменні пэўных урочышчаў, лясоў, азёр, што размяшчаюцца ў вашай мясцовасці? Тады дасылайце свае лісты з пытаннямі на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, газета «Звязда». Або па электроннай пошце: nina@zviazda.by з пазнакай «Родныя тапонімы».